**Дзянісаў, В.** Дастойным шляхам / В. Дзянісаў // Патрыёт (Ушачы). — 2006. — 25 кастр. — С. 2.

## ДАСТОЙНЫМ ШЛЯХАМ



Вёсачка Урбанова Сарочынскага сельсавета прыцягвае да сябе прыгажосцю, чысцінёй і ўтульнасцю. Ля кожнага дома – сад і кветнік, кожны дом акуратна пафарбаваны звонку, упрыгожаны знутры ручнікамі, саматканымі дарожкамі і покрыўкамі. Гаспадыні ўмеюць прыняць гасцей, смачна гатаваць. Прыехаць туды на свята – гэта незвычайная асалода.

Усе жыхары цудоўныя, па-свойму цікавыя, але мне хочацца расказаць аб Таццяне Іванаўне Саўчанка, якая гасцінна запрасіла ўсіх прыехаўшых і аднавяскоўцаў у свой дом. Гэта абаяльная, і ў той жа час стойкая, мужная жанчына рана пазнала выпрабаванні.

Нарадзілася яна ў вёсцы Жывалака, выйшла замуж. Яе муж Макар Аляксандравіч працаваў механізатарам у калгасе «Чырвоная Полаччына». За добрасумленную працу быў узнагароджаны ордэнамі. Усяго 45 гадоў аддаў ён сельскай гаспадарцы. Склалася так, што пасля цяжкай хваробы ў 50-гадовым узросце ў яго памерла маці, і сіротамі засталіся трое дзяцей – 11, 13 і 15 гадоў. Іх аддалі ў дзіцячы дом, але на ўсе святы, канікулы яны прыязджалі да свайго брата, дзе аб іх клапацілася акрамя яго і Таццяна Іванаўна. Калі дзеці выраслі, сям'я Саўчанкаў дапамагла кожнаму атрымаць адукацыю і ўладкаваць сваё асабістае жыццё.

А ў сям'і ж Макара Аляксандравіча і Таццяны Іванаўны было і сваіх трое дзяцей. На сённяшні дзень яны таксама атрымалі спецыяльнасці і ідуць сваімі сцяжынамі. Гэта жанчына цяпер ужо бабуля чатырох унукаў. Яна любіць іх, удзяляе ўвагу, а ў вольныя хвіліны захапляецца ткацтвам, вышываннем. У яе цудам захаваліся некалькі самаробных ручнікоў. Менавіта цудам захаваліся, таму што вясной 2001 года ад няспраўнасці электраправодкі ў адно імгненне, сярод белага дня загарэлася і поўнасцю спапялілася хата. Напамін аб той бядзе – пачарнелая сцяна хлява. Мала што змагла выратаваць сям'я з ахопленага агнём дома.

Таццяна Іванаўна і Макар Аляксандравіч стойка перанеслі такую бяду. Прыгадваючы пажар і яго вынік, жанчына да сённяшняга нясе ў сэрцы ўдзячнасць за дапамогу – аддзелу сацыяльнай абароны насельніцтва райвыканкама, Белдзяржстраху, філіялу аддзялення «Беларусбанк», жыхарам гарпасёлка, вёсак Пятніцы і Урбанова, усім, хто аказаў падтрымку ў цяжкія хвіліны.

Былая райсельгасхімія, дзе працуюць два сыны Саўчанкаў-старэйшых, выдзеліла ў часовае карыстанне вагончык. Рашэннем райвыканкама сям'я бясплатна атрымала лес, каб зноў пабудаваць сваё жыллё, пачала расчышчаць папялішча, заліваць фундамент.

Паступова, з дня на дзень бяда адыходзіла. Але яна не бывае адна, і ў хуткім часе, у 2004 годзе памёр Макар Аляксандравіч. Гэта было чарговай трагедыяй для Таццяны Іванаўны. Але жыццё працягвалася, трэба было ісці далей, дапамагаць дзецям і ўнукам.

У свой час шмат перажыванняў было ў маці, калі яе сын служыў у Савецкай Арміі, выконваў свой інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане. Яна не дасыпала начамі, перажывала, чакала сваю крывінку. І ўсё абышлося. Пасля вяртання з арміі сын падарыў сваёй мамачцы песню. Таццяне Іванаўне яна і прыйшлася па душы, і жанчына развучыла яе. Цяпер спявае сваім родным і знаёмым. Выканала і на свяце вёскі. А яшчэ любіць спяваць са сваёй аднавяскоўкай Зінаідай Уладзіміраўнай Первянёнак. Шмат прыгожых, меладычных песень яны выканалі дуэтам.

Таццяна Іванаўна Саўчанка – жыццярадасны, цікавы чалавек, вельмі любіць парадак і ўтульнасць, заўсёды добразычлівая да людзей. У яе доме бясконца бываюць дзеці і ўнукі, дапамагаюць па гаспадарцы, дзеляцца апошнімі навінамі. Жанчына трымае кароўку, чацвёра свіней, тры дзесяткі курэй. Маецца пчальнік, якім займаецца сын. Сёлета ў Таццяны Іванаўны вялікі ўраджай яблыкаў, якімі яна частуе тых, у каго іх няма.

Здароўя, даўгалецця хочацца пажадаць такой цудоўнай жанчыне.

**В. Дзянісаў**,

наш грамадскі карэспандэнт

На здымку: сям’я Саўчанкаў (фота з сямейнага архіва)